МАЕ МАЛЕНЬКІЯ СЯБРЫ!

ВАШ ТАТА БІЗНЕСМЕН?
ЕН ПРАЦУЕ Ў СУМЕСНЫМ ЦІ ЗАМЕЖНЫМ ПРАДПРЫЕМСТВЕ?
А МОЖА, ЁН ДЫРЭКТАР БЕЛАРУСКАЙ ФАБРЫКІ, ЯКАЯ ВЫРАБЛЯЕ ПРАДУКЦЫЮ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ, СЯМ'І І АДПАЧЫНКУ?


ПАКАЖЫЦЕ ЯМУ НАШ ЧАСОПІС.

ЧАСОПІС «МІКІ МАУС» ЧЫТАЮЦЬ НЕ ТОЛЬКІ ДЗЕЦІ, АЛЕ І ІХ БАЦЬКІ Ў БЕЛАРУСІ І Ў ІНШЫХ КРАІНАХ СВЕТУ, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ НАШЫ СУАЙЧЫННІКІ.


АРЫГІНАЛЬНАЯ І САМАЯ ЭФЕКТЫЎНАЯ РЭКЛАМА Ў КАЛЯРОВЫМ АМЕРЫКАНСКІМ ЧАСОПІСЕ «МІКІ МАУС!

НАШ АДРАС У МІНСКУ: 220030,
МІНСК, ВУЛ. ЭНГЕЛЬСА, 26. ТЭЛ. 26-12-43





Якая дэталь паўтараецца?



Дональд працуе ў сваім газетным кіёску. Адна дэталь малюнка на вокладках часопісаў паўтараецца 5 разоў! Якая???

Адказ:




Наступным днём...
А вось і востраў!
О, я спадзяюся, што Базыль тут. І на ўсякі выпадак прыхапіла ягонага лялечнага мядзведзя! Тады ён яго забыў!
Га?!!
Думаю, што цяпер яму лялечны мядзведзь не спатрэбіцца!
Вой! Нас атакуюць!
Глянь!
Некалькі коп'яў прабілі бензабак!
Аааааа! М-мы разабемся!
Падрыхтуйцеся пакінуць самалёт!
Давай!


ХРААААСЬ!
Нырайце, каб вас не заўважылі!
У хуткім часе...
Будзьце пільнымі! Зразумелі?
А як мы вернемся? Самалёт ушчэнт разбіўся!
О, Божа! Мы ж прыляцелі сюды шукаць Базыля! Дык давайце, за працу!
Глядзіце! Сляды чалавека!
Ну, што разгубіліся? Пайшлі па слядах!
Глядзіце! Вунь там!
Б-б-божа! Як гэта ён там апынуўся?


Пару хвілін назад ён быў на беразе!
Гэта не наш самалёт. Гэта той, на якім сюды трапіў маленькі Базыль!
Выдатна! Трэба пашукаць там які-небудзь сляды!
Мяркую, лэдзі Уайтсток, што ніякіх слядоў там даўно няма!
Няма прыёмніка! Можа яго забралі выратавальнікі, калі знайшлі пілота?!
Здаецца, я ведаю, чаму гэты самалёт разбіўся!
Ён быў надта цяжкім! З усімі гэтымі раслінамі ён, пэўна...
Аааааааааай!!
Глядзіце!
Б-б-божа!


Гэй! Мы сябры!
Базыль! Гэта ён, безумоўна! Выліты мой брат у маладосці!
Нічога сабе! Вы бачылі?
Я ўпэўнена, яго нехта схапіў! За імі!
Але...
Давайце разыдземся! Гэта падвоіць нашыя шанцы хутчэй выратаваць Базыля!
Ніякіх слядоў! Што за жахлівыя людзі схапілі яго?
Вы ідзіце са мной, лэдзі Уайтсток! А ты, Гуфі, будзь асцярожны!
Ага!
Але хутка...
Га?!! Што?!!
КРРРРААХ!


ААААААААААА!!
РРРРРРРРР!
ВООООЙ!
Але...
Аааааааай!!
ХРАСЬ! ТРЭСЬ!
ТРЭСЬ!
ВООООЙ!
АДЧАПІСЯ!
КРАК!
ООООООХ!
КРАК!


ААААААХ!
ПЛЮХ!
Д-дзякуй! Ох! Не вельмі гасцінны востраў!
Тым часам...
Вой! Мы ніколі не знойдзем яго ў гэтых джунглях!.. Ооо! Якія негасцінныя жывёлы!
Сюды! Давайце схаваемся ў гэтай пячоры!
БУХ!
БАХ!
Вось мы і тут!
АААХХ!
АААААЙ!


РАТУЙЦЕ!
РРРРРРР!!
Ёсць тут
хто?
Рукі ўгору!
Ці мы
страляем!
ААААААА!
БАБАХ!!
Га? Здаецца
прамахнуліся!
Толькі Гуфі мог
палічыць антэну
за змяю!
Ооо... гэта
Глядзі! Гэта
чыясьці хата!
А цяпер для вас
музычная
праграма!



У хуткім
часе...
Здаецца, мы адарваліся ад яго,
містэр Маус! Жахлівая істота!
А! Глядзіце!
Калі ён усходзіцца,
я з ім разбяруся!
Г-Гуфі!
Вой! Д-дзякуй
Богу, гэта вы!
Што з ім
здарылася?
А-АЎП!
Ааааааааа!
Гэта мае!
Н-не
зразумеў?!
АХ?!!



ЗАБАВЫ КАЧАНЯТ

ДЫСТАНЦЫЙНАЕ ВЫРАТАВАННЕ





Нам трохі не пашанцавала, што на шпіку самалёта апынулася гэтая дрэва! Я адрамантую кнопку кіравання, і самалёт зноў будзе лятаць!
Мне трэба ў горад па справах! Хлопчыкі, вы абяцалі пагуляць з Пончачкай!
Паспрабуем яшчэ!
Цяпер мая чарга!
Вядома, але давайце перш паглядзім, што там новага ў Зігзага!
Ён казаў, што яго новы самалёт апошняй мадэлі амаль гатовы!
Як ідзе рамонт, Зігзаг?
Амаль усё зроблена, хлопчыкі! Які прыгожы самалёт, праўда?
Спачатку я паспрабую кіраваць самалётам з дапамогай дыстанцыйнага кіравання, каб упэўніцца, што ўсё ў парадку, перш чым сесці за штурвал!
Дыстанцыйнага кіравання? На такім старым самалёце?
Гэта ён звонку стары! А ў сярэдзіне ўсё новае! І не турбуйце мяне! Я заняты!



Давайце пагуляем з нашым самалётам тут, каб Зігзаг убачыў!
А можна і мне?
Не, Пончачка! Ты толькі мяшаць будзеш!
Няхай ён абляціць вакол ангара!
БЗЗЗ!
Клас! Зігзагу спадабаецца!
Бачыў наш самалёт, Зігзаг?
БЗЗЗЗ!
Га?.. А, гэта вы! Мой самалёт падрыхтаваны для праверкі!
Ідзіце сюды, хлопчыкі, і паглядзіце на пульт кіравання!
Во! Бадай што, лепшы за наш?
Трэба хутчэй пасадзіць мадэль! Я таксама хачу паглядзець на пульт кіравання Зігзага!
Вось гэта кантралюе элероны і штурвал! А вось гэта — дросель!


Цікі, магу я пагуляць з вашым самалётам?
Можаш! Але потым вернеш яго!
Гэтая кнопка ўключае матор!
А калі націсну тут, самалёт паедзе на ўзлётную паласу!
ДРРР!
А цяпер глядзіце, як ён узляціць, калі я націсну вось тут!
ДРРР!
Выдатны ўзлёт, Зігзаг!
А вось гэтым рычагом я магу рабіць петлі і іншыя цікавыя рэчы!
Ооооі!
ДРРЫДРРЫДРРЫ!
Няшчасце! Што гэта?? Самалёт не слухаецца!
Во дае! Проста выдатна!
Што? Гэта ж голас Поначкі!


(Вой!) Што ты робіш на маім самалёце, Поначка?
Я залезла сюды, каб узяць мадэль хлопчыкаў... і цяпер лячу на сапраўдным самалёце!
Трэба пасадзіць самалёт на зямлю! І якраз сапсаваўся гэты чартаў пульт!
У мяне ёсць ідэя!
Поначка, гэта Цікі! Ты мяне чуеш?
Чую добра!
Вазьмі мадэль самалёта, Понка, і моцна трымайся за яе, што б ні здарылася!
Зразумела! Канец сувязі!
Вой! Пульт проста з глузду з'ехаў!
Не турбуйся! Я зраблю ўсё вось гэтым!
Вой! Я лячу ўніз галавою!
О-оох!


БЗЗ!
Які клас! Гэта ячшэ цікавей, чым лятаць на самалёце Зігзага!
БЗЗ!
Вой!
Мне якраз тут трэба было выходзіць!
БЗЗ!
Выдатна! Пасадка ў тры прыёмы!
Выдатная работа, Пончык!
ХРАСЬ!
Вой!.. Уся мая праца пайшла прахам!
БЗЗ!
Зігзаг! А чаму б табе не пагуляць у мадэлі самалётаў разам з дзецьмі?!
КАНЕЦ


ДОНАЛЬД ДАК
ВЕЛЬЗЕВУЛ
Мы з Гузам едзем на кірмаш у Вебфуце! Хочаш паехаць з намі, Дональд?
Не, дзякуй, бабуля! Я сюды прыехаў, каб адпачыць у цішыні і спакоі, таму проста пакармлю жывёл!
Мы едзем праз дзесяць хвілін, згаджайся!
Не! Нават вясковы кірмаш будзе для мяне надта шумны пасля цікага жыцця тут!
Адзін толькі Вельзевул не можа ўтаймавацца на ферме! Не хацеў бы я раззлаваць яго!
Дзіўна, што ён ячшэ жуе сена, а не калючы дрот! Гэта яму б больш падыходзіла!
Вой! Вілы проста выслізнулі з маіх рук!



О, нееее!!
РРРРРРР!!
МММММММ!
Н-не! Я не хачу! Я...
РРРРРРР!!
ВООООООЙ!
РРРРРРР!!
Ра-туй-це!!
РАТУЙЦЕ! РАТУЙЦЕ!
РРРРРРРРРР!!
Вельзевул!! Угаманiся!
Сядзець!!
ВОХ!
І не чапай Дональда, непаслухмяны бык! Ты будзеш ягоным сябрам! Зразумела?
Не думаю, што ён згодзіцца, бабуля!
Цяпер ён будзе паводзіць сябе як трэба!
Ты думаеш?
Ага!! Глядзіце!!
Я знайшоў яго! Знайшоў сапраўднага Вэнтыйскага Рудога!
Неверагодна, праўда?
Самая рэдкая парода ва ўсім свеце! Ён павінен быць маім! Спыні машыну!
Дзень добры, спадарыня! Я б хацеў купіць вашага быка! Колькі вы за яго хочаце?
Вельмі прыемна! Але Вельзевул не прадаецца! Ён у нас як член сям'і!
Назавіце вашу цану! Я заплачу, колькі скажаце!
Ён не прадаецца! Ні за якія грошы! А цяпер бывайце, сэр!
Прадаць Вельзевула! Ды як ён мог дадумацца да такога!
А я б яго дарам аддаў!



Крыху пазней...
Прывітанне! Вам дапамагчы?
Так! Мы заблудзіліся! Не маглі б паказаць нам дарогу?
Гэй!! Што вы робіце?!!...
Прабач, даражэнькі! Але мы ўжо знайшлі тое, што шукалі!
Прывяжыце яго да таго крэсла. Потым прывядзіце быка!
Што!! Вы не ўкрадзяце Вельзевула!
Няўжо? І хто мне перашкодзіць, сынок?
Праз момант...
РРРРРРРР!!
Аааааааа! Гэта не так проста, бос!
Ааааааа!!
Нарэшце яму на галаву мяшок! Гэта павінна яго ўгаманіць!
Эх! Ну і памочнікі з вас!
Воооой! Ён не даецца!
Добра, што ў бабулі ёсць чырвоны абрус. Ну, давай, Шалёны Хвост! Гоп-ля!



РРРРРРРРР!!
Не! Не рабі гэтага, Вельзевул!
Вось так! Давай!
Ал-ле!
ХРААСЬ!
ГООП!
Ха, Ха! Вось так! А цяпер паехалі, хлопцы!
А, халера! Трэба ж нешта рабіць!
Не магу ж я сказаць бабулі, што не абараніў Вельзевула!
У хуткім часе...
Вунь яны! Але трэба спяшацца, калі я хачу злавіць іх!
АЭРАПОРТ УЗБФУТ
313


Рдр! Яны не могуць забраць цябе, Вельзевул!
О, Божа!! Не!!
Схапўся!!
В-вох! І на што гэта я раблю...
...дзеля быка, які мяне ненавідзіць!! Вой!
Тым часам...
В-вох! К-колы знікаюць!


Цяпер хоць не змерзну на холадзе!
Крыху пазней...
Добра! А цяпер трэба пра тое-сёе спытаць!
АЭРАПОРТ БУНДАК
Што за джэнтльмен у вялікім капелюшы?
Гэта ж Хірам Дж. Лампсакер, сыноК! Ён гаспадар самага вялікага ранча ў графстве Бундак!
У хуткім часе...
Дзень добры! Я хачу падаць скаргу!
ШЭРЫФ
Хірам Дж. Лампсакер украў быка ў маіх сваякоў! Я хачу каб быка вярнулі...
Здаецца мне, што ты памыляешся, сынок!
Бос Лампсакер самы паважаны чалавек у нашым графстве! І твая хлусня можа дорага каштаваць табе, хлопча!
Га?
Ммм! Гэты шэрыф мне не дапаможа!
Усё зразумеў, сынок?



Праз некаторы час...
Дык гэта і ёсць ягонае ранча? І недзе там Вельзевул! Трэба ратаваць яго!
ДЗЗЗЗІНЬ!
О, мой Божа!! Уключылася сігналізацыя!
Не рухайся! Яны вельмі любяць мяса качанят!
ГРРРР!
ГРРР!!
Пазней...
Ну што, злодзей? Хацеў украсці маю скацціну?!
Гэта ты злодзей! Ты ўкраў быка!
Вось як! Гэта сур'ёзна! У нас ніхто не можа без падставы абразіць Хірама Дж. Лампсакера!
Закіньце яго на гарышча! Шэрыф з памочнікамі зараз будзе!
Грр! Я не збіраюся чакаць, пакуль мяне забяруць у астрог па фальшывым абвінавачванні!
БРАСЬ!



Вельмі зручны навес! Наш бос Лампсакер не зусім добра выбірае месцы для зняволення!
І тут...
Гэй!!
Ах-ох!
Вой! Куды цяпер?!! Дзе ж схавацца!
Вунь там! Можа, яны праскочаць міма!
Вой! Стойла Вельзевула!
Га? А ён, здаецца, больш не злуецца на мяне!
Пазнаў мяне! І ён такі добры! Ну, браток! У нас ёсць шанц!
ЧМОК!


Вельзевул, дружа, надышоў час нам выходзіць!
Цяпер... наперад!
МММУУУУУУУУ!!
ХРАААСЬ!!
Малайчына!! Наперад, дружа!
Стаяць і не рухацца, хлопец!
Здавайцеся і вядзіце сябе ціха... а мы вам нічога дрэннага не зробім!
Ды няўжо?
А вось мы можам нарабіць ім шкоды, га, Вельзевул?!
Гатовы?
Наперад, Вельзевул!!
ХРАААСЬ!
Ааааааааа!!
Ратуй-це!
Йііііі!!
Ха, ха! Весела праўда?
А вось і наш шэф! За ім, Вельзевул!!
Йііііі!!
АААААААА!!





© DISNEY Сумеснае выданне „ЭГМОНТ" (Данія) — „ГРУНВАЛЬД" (Эстонія) Пераклад з англійскай мовы